© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

# RETURN OF THE "LONG GENEALOGY" TO SCHOOL TEXTBOOKS ON THE HISTORY OF BELARUS

**Aliaksei Lastouski**

Polotsk State University, Belarus

OCRid: 0000-0002-5034-7454

**Summary**. *Author of this article analyzes texts of series of school textbooks on the history of Belarus, which were published in 2016–18. The author argues that, in comparison with previous textbooks, there is an increasing trend to derive the origins of Belarusian statehood from the history of the Principality of Polotsk, as well as emphasizing the Belarusian character of the Grand Duchy of Lithuania. The reconstruction of school textbooks can be considered as part of a larger turn in the historical politics of the Belarusian authorities, the transition to the "long genealogy" of Belarusian statehood.*

**Key words:** *historical politics, school textbooks, national narrative, genealogy of statehood*

# ВЯРТАННЕ "ДОЎГАЙ ГЕНЕАЛОГІІ" У ШКОЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Аляксей Ластоўскі**

Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт

OCRid: 0000-0002-5034-7454

***Рэцэнзія.*** *У артыкуле разглядаецца серыя школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі, якія выйшлі ў 2016-18 гадах. У параўнанні з папярэднімі падручнікамі заўважная тэндэнцыя выводзіць вытокі беларускай дзяржаўнасці з гісторыі Полацкага княства, а таксама падкрэсліваць беларускі характар Вялікага Княства Літоўскага. Перастварэнне школьных падручнікаў можна разглядаць як частку больш шырокага павароту ў гістарычнай палітыцы беларускіх уладаў, пераходу да "доўгай генеалогіі" беларускай дзяржаўнасці.*

**Ключавыя словы**: *гістарычная палітыка, школьныя падручнікі, нацыянальны наратыў, генеалогія дзяржаўнасці.*

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

Падручнікі па гісторыі традыцыйна разглядаюцца як адзін з базавых інструментаў трансляцыі афіцыйнага гістарычнага наратыва праз сістэму школьнай адукацыі. Наколькі манаполія школы на фармаванне калектыўных уяўленняў пра мінулае застаецца актуальнай ва ўмовах безупыннай экспансіі вэб-прасторы – пытанне спрэчнае. Але пакуль што даводзіцца канстататаваць, што іерархічнасць школьнай адукацыйнай сістэмы стварае найлепшыя ўмовы для рэтрансляцыі малодшым пакаленням запатрабаваных дзяржавай гістарычных ведаў.

Ва Усходняй Еўропе эвалюцыя нацыянальных гістарычных наратываў шмат у чым была перарваная камуністычным эксперыментам, але з пачаткам 1990-х гадоў назіраецца эпоха інтэнсіўнай нацыяналізацыі гістарычнай адукацыі, якая мусіла максімальна хутка ліквідаваць папярэднія адхіленні, адноўленая нацыянальная гісторыя была пастаўленая ў цэнтр посткамуністычнага нацыянальнага будаўніцтва (Janmaat and Vickers 2007).

У гэтай рэгіянальнай сітуацыі кейс Беларусі выглядае досыць асаблівым. Пачатак 1990-хвыглядаў тыповай для рэгіёну экстэнсіўнай нацыяналізацыяй гістарычнай веды, і ў тым ліку сістэмы гістарычнай адукацыі. Была распрацавана нацыянальная канцэпцыя гісторыі, якая шмат у чым базавалася на былых марксісцкіх падыходах, але зараз прыярытэтам абвяшчаліся пошукі ўласнай дзяржаўнасці і этнічнасці ў гісторыі, стварэнне доўгай лініі генеалогіі беларускай нацыянальнай дзяржавы, што мусіла стаць падмуркам для фармавання нацыянальнай самасвядомасці (Біч 1993; Сагановіч 2001). Падкрэсліванне еўрапейскага характару беларускай гісторыі таксама азначала і максімальнае дыстанцаванне ад Расіі (якой імпліцытна прысвойваўся гэтым статус азіяцкай дзяржавы), па сутнасці, адбывалася антыкаланіяльная рэвізія мінулага. Але для новаабранага ў 1994 годзе Прэзідэнтам краіны Аляксандра Лукашэнка (які ў гэтым статусе застаецца і па сённяшні дзень) прыярытэты гістарычнай палітыкі выстаўляліся іншым чынам: арыентацыя на інтэграцыю з Расіяй і пазітыўны вобраз савецкага мінулага як інструмент мабілізацыі палітычнай падтрымкі ў масах. Лукашэнка “*павярнуў беларускую гістарыяграфію назад да сваіх панславіцскіх, русафільскіх і савецкіх каранёў*” (Kuzio 2002: 254; гл. таксама Нордбэрг, Кузё 2001), фактычна паўстаў новы афіцыйны наратыў, які з рознымі трансфармацыямі трымаецца да гэтагу часу.

Яшчэ адной важнай асаблівасцю афіцыйнага дзяржаўнага наратыва лічылася яго “кароткая генеалогія”. Дэвід Марплз пісаў пра тое, што Лукашэнка “прызнае гістарычную спадчыну беларусаў толькі выбіральна — адно ў расейскім кантэксце” (Марплз 2007), а “гісторыя як форма дзяржаўнай палітыкі абсякаецца і абмяжоўваецца савецкім перыядам – за кошт важных асноватворных перыядаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай” (Марплз 2006: 173). Такім чынам, апроч ступені селектыўнасці, адным з галоўных адрозненняў нацыянальна-дэмакратычнай версіі гісторыі ад афіцыйнай лічыцца яе працягласць — “гісторыкі-нацыяналісты” ствараюць міфы даўняга паходжання беларусаў, адшукваюць у далёкай гісторыі протанацыянальныя дзяржаўныя ўтварэнні і пяюць асанну Залатому веку (Wilson, 1997). Тады як для альтэрнатыўнага — афіцыйнага наратыву “сапраўдная” гісторыя

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

пачынаецца ў 1917 годзе" (Brzozowska, 2003: 52), то бок супадае з усталяваннем савецкай дзяржаўнасці. Пры апісанні ўладна-афіцыйнага дыскурсу ў Беларусі адмысловая ўвага надаецца сталым спасылкам на гісторыю, якія галоўным чынам зводзяцца да гераізацыі Вялікай Айчыннай вайны праз стварэнне міфа пра моцны партызанскі рух (Leshchenko 2004; Ioffe 2007; Гансэн 2006). Падкрэсліваецца, што для дзяржаўнай ідэалогіі беларускі "міф заснавання" (які ў нацыянальнай гістарыяграфіі адсылае да часоў Полацкага княства) *"засноўваецца ў першую чаргу на партызанскай барацьбе ў часы Другой Сусветнай вайны, а партызаны ўспрымаюцца як людзі, якія зрабілі магутныя высілкі для абароны дзяржавы супраць знешняга агрэсара"* (Leshchenko 2008: 1420).

Але што адбывалася пазней? Якія змены мы можам назіраць у беларускай ідэалогіі і палітычнай арыентацыі Аляксандра Лукашэнка? Як змянілася гістарычная палітыка ў Беларусі у XXI стагоддзі? Я ўжо выказваўся, што мадэль, якая апісвае беларускую гістарычную палітыку як выключна русафільскую і прасавецкую, мадэль даўно страціла эўрыстычную рэлевантнасць, і гэта патрабуе большай увагі да новых эмпірычных даследаванняў і выкарыстання новых тэарэтычных мадэляў (Ластоўскі 2014).

У якасці аднаго з асноўных эмпірычных маркераў для адсочвання зменаў у гістарычнай палітыцы можна ўзяць падручнікі па гісторыі Беларусі. Ёсць некалькі даследаванняў беларускіх гістарычных падручнікаў, асабліва мы вылучым аналітычны тэкст Таццяны Астроўскай "Генеалогія гістарычнай памяці беларусаў у кантэксце адукацыйных практык", апублікаваны ў 2010 годзе (Островская 2010). Даследчыца вылучае яшчэ адзін прынцыповы парадыгмальны зрух у беларускай гістарычнай палітыцы, які адбыўся прыкладна з 2001 года. Яна абапіраецца на перыядызацыю беларускага палітолага Андрэя Казакевіча, які лічыць, што з гэтага часу "стратэгія экспансіі, кіраванай уласнай палітычнай місіяй (якая мела толькі частковы поспех у падпісанні шэрагу дамоваў, мемарандумаў ды пратаколаў з Расіяй), змяняецца стратэгіяй самазахавання і адаптацыі да неспрыяльнага і варожага асяроддзя. Імперская свядомасць, працятая палітычным "нонканфармізмам", прадчуваннем апакаліпсісу і падзеннем глабальнага (ці, прынамсі, рэгіянальнага) парадку, выціскаецца тактыкай кантэкстуалізацыі і лакалізацыі рэжыму" (Казакевіч 2004: 55). Можна казаць пра ўсталяванне якасна новага этапу ў самаразуменні і самаапісанні беларускай улады, які знайшоў найбольш яскравае праяўленне ў запуску праекта беларускай дзяржаўнай ідэалогіі. Таццяна Астроўская адзначае, што з гэтага часу фарміраванне гістарычнай памяці становіцца больш свядомым і мэтанакіраваным, а гісторыя пачынае рэалізоўваць функцыю барацьбы за фармаванне новага індывіда, які б убудоўваўся ў вызначаныя дзяржаўнай сістэмай рамкі. Адпаведна, у школьнай сістэме гістарычнай адукацыі прасочваецца тэндэнцыя "акумуляваць дасавецкія падзеі беларускай гісторыі, зацвердзіць старажытнасць беларускай нацыі, адшукаць глыбейшыя карані беларускай дзяржаўнасці. Вытокі апошняй, як правіла, адносяць або да Полацкага княства, якое пазіцыянуецца як аўтаномная супольнасць у складзе Кіеўскай Русі, або да Вялікага Княства Літоўскага (Островская 2010).

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

Тым не менш, гэтыя канцэптуальныя змены не заўжды патрапляюць у фокус даследчыкаў, так і пазней, у 2015 годзе, можна сустрэць высновы, што ў дадзены момант школьныя падручнікі па гісторыі служаць легітымацыі сувязей з Расіяй і апраўданню асаблівай сацыяльна-палітычнай сістэмы (Zadora 2015). У дадзеным выпадку мы бачым рэтрансляцыю ўстойлівага тэзіса пра русафільскі характар беларускай гістарычнай палітыкі, які застаецца нязменным і на актуальным этапе — і які вызначае змест школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі. Правамоцнасць гэтага тэзіса можна праверыць праз эмпірычны аналіз школьных падручнікаў, што і будзе зроблена ў другой частцы артыкула. На жаль, пасля публікацыі 2010 года Таццяны Астроўскай больш такіх комплексных і эмпірычна арыентаваных публікацый не з'явілася, хоць асобныя аспекты падручнікаў разглядаліся: так, Таццяна Шчурко аналізавала гендарны аспект, а менавіта прысутнасць жанчын на старонках падручнікаў (Шчурко 2016), Аляксей Братачкін дадаў да гендарнай крытыкі таксама заўвагі ў адсутнасці крытычнага погляду і ігнараванні сацыяльнай гісторыі (Братачкін 2018). Для мэтаў гэтага тэксту дадзеныя аспекты не з'яўляюцца прыярытэтнымі, я прапаную вярнуцца да пытання, пастаўленага Таццянай Астроўскай: ці можам мы казаць, што ў беларускіх школьных падручніках па гісторыі выбудоўваецца самастойная версія гісторыі, арыентаваная на ўмацаванне незалежнасці краіны?

Давядзецца зрабіць яшчэ адну тэарэтычную рэмарку, для аналізу падручнікаў я прапаную адмовіцца таксама ад дыхатамічнага падзелу на нацыянальны/прасавецкі гістарычны наратыў, паколькі ён не мае асаблівай вартасці для аналізу стратэгіі гістарычнай палітыкі ў Беларусі. Я ўжо раней прапаноўваў замяніць гэту апазіцыю мадэллю, якая накіраваная на інтэграцыю гістарычных ведаў у адзін кантынуум, які можа існаваць за кошт выключэння розных "экстрэмальных" інтэрпрэтацый. Тады, па сутнасці ствараецца "мяккая" кампрамісная версія гісторыі, дзе пад эгідай беларускай дзяржаўнасці аб'ядноўваюцца розныя гістарычныя перыяды (Ластоўскі 2014). Прынцыповай працэдурай тады становіцца выдаленне альбо замоўчванне канфліктных эпізодаў, і гэту тэндэнцыю вылучаў Аляксей Братачкін, калі разглядаў, якія змены адбываюцца са школьнымі падручнікамі па гісторыі Беларусі (Братачкін 2018).

Я лічу, што адбываецца своеасаблівае прысваенне беларускай дзяржавай гістарычнага мінулага, розныя падзеі інтэрпрэтуюцца з пазіцый палітычнай незалежнасці і нацыянальнай значнасці. "Беларусізуецца" ў такім падыходзе і савецкае мінулае. Беларускі савецкі перыяд можа разглядацца не як камуністычны эксперымент, а як шлях пазітыўнай эмансіпацыі беларускай нацыі ў своеасаблівых гістарычных абставінах. Сучасная беларуская дзяржаўнасць тады разглядаецца як найвышэйшы этап развіцця памкнення беларусаў да самастойнасці. Папярэдняя гісторыя набывае разам з тым тэлеалагічны сэнс як падрыхтоўка да гэтай амаль утапічнай карціны. Адпаведна, можна высунуць гіпотэзу, што за апошнія 8 год з моманту даследавання Таццяны Астроўскай у новай генерацыі падручнікаў па гісторыі Беларусі гэта тэндэнцыя інтэрпрэтацыі мінулага праз прызму беларускай дзяржаўнасці толькі ўзмацнілася.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

Маркерам для праверкі гэтай гіпотэзы будзе замена “кароткай генеалогіі” беларускай дзяржаўнасці на “доўгую генеалогію”, уключэнне ў якасці дзяржавастваральных перыядаў Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага, інтэрпрэтацыя іх у катэгорыях незалежнасці і беларускага этнічнага элементу.

Натуральна, цікава было прааналізаваць і інтэрпрэтацыю ХХ стагоддзя, але тут даводзіцца абмежавацца з-за “супраціўлення эмпірыі”. Справа ў тым, што ў 2016 годзе было абвешчана пра падрыхтоўку новай серыі школьных падручнікаў па гісторыі Беларусі, з якіх на дадзены момант выйшлі тры падручнікі для 6-8 класаў, якія даводзяць гісторыю краіны да пачатку ХХ стагоддзя[99].

Выкладанне адбываецца паводле храналагічнага прынцыпу, але мы назіраем паступовую змену разбіўкі гістарычных перыядаў па класах:

| | **Актуальны падручнік** | | | **Папярэдні падручнік** | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Клас** | **Год** | **Перыяд** | **Аўтары** | **Год** | **Перыяд** | **Аўтары** |
| 6 клас | 2016 | Са старажытных часоў да канца XV ст. | Юрый Бохан, Сцяпан Цемушаў | 22009 | Са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. | Георгій Штыхаў, Сцяпан Цемушаў, Васіль Ракуць (1945) |
| 7 клас | 2017 | XVI-XVIII стст. | Васіль Варонін, Анастасія Скеп’ян, Андрэй Мацук | 2009 | Другая палова XIII – сярэдзіна XVI стст. | Георгій Штыхаў, Юрый Бохан, М. Краснова |
| 8 клас | 2018 | Канец XVIII ст. – пачатак XX ст. | Сяргей Паноў, Святлана Марозава, Уладзімір Сосна | 2010 | Другая палова XVI – канец XVIII стст. | Віктар Белазаровіч, Іван Крэнь, Надзея Ганушчанка |
| 9 клас | 22011 | Канец XVIII ст. – пачатак XX ст | Сяргей Паноў, Святлана Марозава, Уладзімір Сосна | 1997 | 1917-1996 | Уладзімір Сідарцоў, Віталій Фамін, Сяргей Паноў |
| 10 клас | 2012 | 1917-1945 гг. | Яўген Новік | 2008 | Са старажытных часоў да кастрычніка 1917 г. | Якаў Трашчанок, А. Вараб’ёў, В. Валжанкоў |
| 11 клас | 2013 | Другая палова 1940-х – пачатак XXI ст. | Віталій Фамін, Сяргей Паноў, | 2009 | Кастрычнік 1917 – пачатак XXI ст. | Якаў Трашчанок, А. Вараб’ёў, М. Жалязняк |

[99] Сярэдняя школьная адукацыя базуецца на 11-гадовым навучанні, выкладанне гісторыі Беларусі пачынаецца з 6 класа.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Надзея Ганушчанка | | | |

З уважлівага разгляду табліцы бачна, што існуе досыць сур'ёзныя збіўкі па храналогіі ў розных класах. Гэта тлумачыцца тым, што ў 2000-х гадах выкладанне гісторыі вялося па наступнай схеме: 6–9 класы — гэта базавы ўзровень, выкладаецца ўся гісторыя Беларусі (ад старажытнасці да XXI ст.). У 10–11 класах зноў выкладаецца ўся гісторыя Беларусі, толькі ўжо на павышаным узроўні.

У 2008–2010 гг. адбываецца змена, паводле якой у 6–9 класах пачынаюць выкладаць гісторыю да канца XIX ст., а ў старэйшых класах тады разглядаецца гісторыя XX ст. Бачым, што зараз адбываецца вяртанне да папярэдняй сістэмы, якая выкарыстоўвалася ў 2000-я гады. Цяжка знайсці ў гэтых кроках туды-назад нейкі сэнс, апроч неабходнасці ажыццяўлення чарговых рэформаў для чыноўнікаў Міністэрства адукацы.

У дадзеным выпадку істотна тое, што ў бліжэйшы час варта чакаць з'яўлення трох новых падручнікаў па гісторыі XIX–XX ст. для 9–11 класаў. Таму ўключаць у аналіз гэты перыяд у гэты момант практычна не мае сэнсу.

Але можна прааналізаваць змены ў адлюстраванні дасавецкай гісторыі Беларусі ў трох генерацыях падручнікаў:

1) Падручнік па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да кастрычніка 1917 г. для 10–га класа, які быў ва ўжытку з 2008 да 2012 г.;
2) Падручнікі для 6–8 класаў, надрукаваныя ў 2009–10 гадах, якія былі ва ўжытку да апошняга;
3) Актуальная серыя падручнікаў для 6-8 класаў, якія былі надрукаваны ў 2016–18 гадах.

Крыху з аналізу выбіваецца падручнік для 11-га класа, але яго варта ўключыць у аналіз, паколькі ён фактычна найлепшым чынам рэпрэзэнтуе русафільскі і прасавецкі перыяд у афіцыйнай гістарычнай палітыцы Беларусі. Галоўным яго стваральнікам быў магілёўскі гісторык Якаў Трашчанок (1931–2011), які ў студэнцкія гады быў універсітэцкім выкладчыкам гісторыі Аляксандра Лукашэнка. Алесь Смалянчук дае наступную характэрыстыку школьным падручнікам, створаным пад рэдкацыяй Трашчанка:

> "У гэтых выданнях відавочная спроба мадэрнізаваць гістарыяграфічную савецкасць з дапамогай канцэпцыі "заходнерусізму" (апошняя трэць XIX – пачатак XX ст.), дапоўненай добрай дозай праваслаўнага празелітызму. Адраджаецца канцэпцыя "древнерусской народности". Пры чым "решающим фактором этнического сплочения восточных славян, консолидации древнерусской народности" абвяшчаецца праваслаўе. Сцвярджаецца, што адыход ад праваслаўя непазбежна абарочваўся "культурной, языковой, этнической ассимиляцией". Дзеячы беларускага нацыянальнага руху асуджаюцца не толькі як "антинародная сила" (традыцыі савецкага часу), але таксама як "антироссийская сила". Менавіта "националисты" трактуюцца як вораг № 1 беларускай гісторыі. Сваю жывучасць дэманструе таксама традыцыйны савецкі вобраз "польскага ворага". Яго ролю адыгрываюць пераважна польскія памешчыкі і каталіцкае духавенства. Гісторыя Беларусі

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

> ізноў тлумачыцца пераважна, як поле дзеяння розных чужародных сіл. Беларусам у чарговы раз адмаўляюць права быць суб'ектам гістарычнага працэсу" (Смалянчук 2012).

Самога Трашчанка лічылі стваральнікам афіцыйнага гістарычнага канону, лідэрам праўладнай гістарыяграфіі. Але варта адзначыць, што словы Алеся Смалянчука прагучалі на канферэнцыі ужо праз некалькі месяцаў пасля смерці Якава Трашчанка (14 жніўня 2011 года)[100], і для разумення кантэксту важна адзначыць, што неўзабаве на працягу двух год усе падручнікі пад рэдакцыяй магілёўскага гісторыка былі выведзены з ужытку.

Але пяройдзем да аналізу, найперш нас цікавіць, рэпрэзентацыя гісторыі Полацкага княства, якое традыцыйна ў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі лічыцца пачатковым перыядам беларускай дзяржаўнасці. У дадзеным выпадку асабліва рэлевантныя пытанні самастойнасці/залежнасці ад Кіеўскага княства, і асабліва пытанне існавання старажытнарускай народнасці (з існавання гэтага этнасу звычайна выводзіцца роднасць рускіх, украінцаў і беларусаў, якія бяруць вытокі з адзінай супольнасці).

Прадказальна, што найбольш акцэнтавана адзінства Рускай зямлі падаецца ў падручніку Трашчанка (2008):

> "Усе землі-княствы ўспрымаліся іх сучаснікамі як складаныя часткі адзінай Рускай зямлі... усе яны ўзначальваліся рознымі лініямі адзінай княжацкай дынастыі" (Трашчанок 2008: 31).

У сваім улюбёным стылі Трашчанок выкарыстоўвае старонкі школьнага падручніка для жорсткай палемікі з нацыянальна арыентаванымі гісторыкамі: "поўны распад Русі на самастойныя каралеўствы-княствы — гістарыяграфічны міф" (Трашчанок 2008: 30). Для гістарыясофіі Трашчанка характэрна вылучэнне рэлігіі як ключавага фактара гістарычнага развіцця і асновы этнічнай/нацыянальнай самасвядомасці:

> "Адзіная вера ў адзінага Бога стала вышэйшай духоўнай каштоўнасцю, узвысілася над радавой свядомасцю і паступова з'яднала родаплемянныя групы ўсходніх у адзіны старыжытнарускі хрысціянскі народ" (Трашчанок 2008: 35).

У той жа час школьнікі 6 класа вучылі іншую версію гісторыі Полацкага княства (2009): падкрэсліваецца, што князь Рагвалод праводзіў незалежную ад Кіева палітыку, пасля апісання гвалтоўнага захопу Полацка князём Уладзімірам адзначаецца, што з часоў Ізяслава Полацкім княствам кіравала ўласная княская дынастыя. Захоўваецца сцверджанне пра існаванне адзінай дзяржавы, Старажытнай (Кіеўскай) Русі, але яна выглядае ўжо не такім духоўным маналітам:

[100] Сімпатамычна, што ў газеце "Наша ніва" матэрыял на смерць Трашчанка быў названы "Памёр ідэолаг лукашэнкаўскай гісторыі Беларусі" (Наша ніва 2011).

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

> "Старажытнарускія княствы праводзілі самастойную палітыку, іх правіцелі варагавалі паміж сабою. Тым не менш Старажытная Русь захоўвала адноснае адзінства" (Штыхаў і Цемушаў 2009: 79)[101].

Падтрымліваецца ідэя існавання старажытнарускай народнасці, якая стала падмуркам для трох народаў — беларускага, рускага і ўкраінскага (менавіта ў такой паслядоўнасці), таксама прысутнічае тэза, што продкі гэтых трох народаў у IX–XIII стагоддзях размаўлялі на адной мове (Штыхаў і Цемушаў 2009: 80)[102].

У найноўшым падручніку па гісторыі Беларусі для 6 класа, які выйшаў у 2016 годзе, глава пра гісторыю Полацкага княства напісана тым жа самым аўтарам (Сцяпан Цемушаў), але характэрна змененыя акцэнты: так, Рагвалод праводзіў ужо **цалкам** незалежную ад Кіева палітыку, значна больш увагі надаецца гісторыі Рагнеды і Ізяслава, і таксама падкрэсліваецца, што з праўлення апошняга наноў аднаўляецца самастойнасць княства:

> "З таго часу — з 988 г. — у ім кіравала ўласная княжацкая дынастыя. Полацкія князі зноў сталі ўмацоўваць сваю ўладу. Іх палітыка часта супярэчыла інтарэсам Кіева" (Бохан і Цемушаў, 2016: 77).

Знікае са старонак падручніка і выказванне, што старажытнаруская народнасць была падмуркам фармавання трох усходнеславянскіх народаў. Замест тэзы пра адзінства мовы выкарыстоўваецца асцярожнае сцверджанне, што "літаратурная мова ва ўсходніх славян была агульнай", і да таго ж, ужо вылучаюцца асаблівасці гутаркавай мовы, і "рысы беларускай мовы з'явіліся ў пісьмовых крыніцах ужо ў першай палове XIII ст." (Бохан і Цемушаў 2016: 79).

Іншы важны гістарыяграфічны маркер нацыянальнай версіі гісторыі — гэта інтэрпрэтацыя перыяду Вялікага Княства Літоўскага. Для беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі характэрна падкрэсліванне важнасці беларускага элемента ў гэтай дзяржаве (першая сталіца — Навагрудак, старабеларуская мова як дзяржаўная), больш за тое, ВКЛ займае неабходную нішу "залатога веку".

У версіі Трашчанка (X10) больш-менш пазітыўна адлюстроўваецца толькі перыяд гісторыі княства да Крэўскай вуніі 1385 г., калі можна казаць пра "непаўнапраўную федэрацыю літоўскіх і рускіх зямель", дзе рускія землі карысталіся шырокай ўнутранай аўтаноміяй. Але непаўнапраўе "тлумачыцца панаваннем у дзяржаве літоўскай дынастыі, якая абапіралася на язычніцкую Аўкштайцію" (Трашчанок 2008: 53). Зноў Трашчанок не прамінае папікнуць у чарговы раз сваіх апанентаў:

> "Вялікае княства не трэба ідэалізаваць. Яго ні ў якім разе нельга трактаваць як "беларускую дзяржаву" (версія нацыянал-экстрэмістаў)...гэта была дзяржава літоўскіх феадалаў" (Трашчанок 2008: 55)

Наступствы Крэўскай уніі між Літвою і Польшчай апісваюцца ў катастрафічных інтанацыях:

---

[101] С.79.
[102] С. 80.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

> "Далейшая гісторыя — гэта гісторыя ўзрастаючай нацыянальнай дыскрымінацыі, каталіцкай экспансіі і рэнегацтва сацыяльных вярхоў Беларусі і Літвы, барацьбы беларускага народа за сваю самабытнасць" (Трашчанок 2008: 64).

Зноў жа, заўважна, што радыкальныя і негатывісцкія погляды Трашчанка істотна разыходзяцца з тым, што прапануецца ў падручніках для сярэдніх класаў, так у падручніку для 7 класа (2009 год) Вялікае Княства Літоўскае характарызуецца наступным чынам (аўтар дадзеных раздзелаў — Юрый Бохан[103]):

> "Гэта была шматэтнічная дзяржава, дзе ўсе народы мірна суіснавалі паміж сабой, дапаўняючы і ўзбагачаючы адзін аднаго. Кіруючая дынастыя паходзіла з асяроддзя літоўскай знаці, а культурнае і гаспадарчае аблічча дзяржавы вызначалі беларускія землі" (Штыхаў і Бохан 2009: 5).

Крэўская унія апісваецца ў больш амбівалентным ключы:

> "Крэўская унія дапамагла ВКЛ у барацьбе з крыжакамі, аднак яна парадзіла новыя супярэчнасці з Польшчай… праваслаўнаму насельніцтву давялося змагацца за такія ж правы, якія атрымалі каталікі" (Штыхаў і Бохан 2009: 34).

Падкрэсліваецца афіцыйны статус старабеларускай мовы, " у выніку старажытнабеларуская культура атрымала ў ВКЛ спрыяльныя ўмовы для развіцця, што садзейнічала фарміраванню беларускай народнасці" (Штыхаў і Бохан 2009: 115).

Другая частка падручніка гісторыі Беларусі для шостага класа яшчэ больш патрыятычна і ўзнёсла акрэслівае беларускі характар ВКЛ (аўтар зноў застаецца тым жа самым, гэта Юрый Бохан): "гэтая дзяржава стала самай магутнай ва Усходняй Еўропе… у цэнтры яе знаходзіліся беларускія землі. Мова і культура нашага народа займалі ў княстве галоўныя пазіцыі" (Бохан і Цемушаў, 2016: 6). Надалей ВКЛ характарызуецца як "балта-славянская дзяржава", адзначаецца, што "уваходжанне беларускіх земляў у ВКЛ было прагрэсіўнай з'явай". Беларускія землі занялі цэнтральнае месца ў краіне, эканамічнае і культурнае развіццё забяспечвалі "вядучую ролю беларускіх зямель у Вялікім Княстве". У досыць нейтральным тоне адзначаецца, што каталіцызм стаў дзяржаўнай рэлігіяй у ВКЛ пасля Крэўскай уніі. Як і ў ранейшым падручніку адзначаецца, што знаходжанне ў ВКЛ спрыяла фарміраванню беларускай народнасці, таму "насельніцтва Беларусі магло лічыць і лічыла гэтую дзяржаву сваёй" (Бохан і Цемушаў, 2016: 57).

Якія высновы можна зрабіць з параўнання прыведзеных інтэрпрэтацый.

> 1. Русацэнтрысцкая версія гісторыі Беларусі ніколі не панавала ў сістэме адукацыі. Быў перыяд (2008-2012), калі ў старэйшых класах выкарыстоўвалі падручнік Якава Трашчанка, напісаны ў радыкальным русафільскім ключы. Але і ў той час паралельна ў малодшых класах вучылі гісторыю па падручніках, якія прапаноўвалі версію памяркоўнага нацыянальнага наратыва. Пасля смерці Трашчанка яго падручнікі выводзяцца са зварота.

[103] На жаль, на наступны год пасля выхада падручніка (2017 год) Юрый Бохан памёр, заўчасна, ва ўзросце 51 года.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

> 2. Адбываецца вельмі важны дыскурсіўны зрух у новых падручніках па гісторыі Беларусі, дзе істотна змяняліся акцэнты на падкрэсліванне незалежнасці Полацкага княства, рознымі шляхамі аргументаецца панаванне беларускага элемента ў ВКЛ. Фактычна адбываецца пераход ад бачання гісторыі праз прызму "кароткай генеалогіі" (дзе Рэспубліка Беларусь грунтуе сваю гістарычную легітымнасць на савецкім перыядзе і перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне) да прыняцця "доўгай генеалогіі", калі выбудоўваецца традыцыя беларускай дзяржаўнасці, якая зыходзіць каранямі ў ранняе Сярэднявечча.

Гэты пераход да "доўгай генеалогіі" яўна адбываецца з санкцыі кіраўніка дзяржавы. Так, у медыях дэманстравалі, як міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў прэзэнтаваў Аляксандру Лукашэнку новы падручнік па гісторыі Беларусі для 6-га класа. Рэакцыя кіраўніка дзяржавы была пазітыўная: "Па словах кіраўніка дзяржавы, ужо на світанку дзяржаўнасці беларусы змаглі адстойваць свой "кавалак зямлі", а веданне аб гэтым застаецца вельмі актуальным і важным і сёння. Пагадзіўся Лукашэнка і з меркаваннем гісторыкаў, што беларусы не павінны быць "бязроднымі". "Калі мы навучым вучыць дзяцей зыходзячы з тых падыходаў — тады выгадуем ганарлівую на самай справе нацыю", — дадаў прэзідэнт" (Sputnik 2017).

Больш за тое, пераход да "доўгай генеалогіі" мае вызначанага лабіста ва ўладных колах — сенатара Ігара Марзалюка, прафесійнага гісторыка-археолага. Адным з апошніх адукацыйных праектаў, які патраніруе Марзалюк — універсітэцкі курс "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці". Таксама 19 красавіка 2019 года падчас паслання Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнка і наступнай серыі адказаў на пытанні сенатар выступіў з прапановай абвесціць 5 чэрвеня (дзень памяці святой Ефрасінні Полацкай, якая была полацкай князёўнай, а пазней была абвешчана святой-патронкай Беларусі) Днём беларускай дзяржаўнасці, але яўна, што такое агрэсіўнае прасоўванне "доўгай генеалогіі" выглядае яшчэ заўчасным для беларускіх рэалій.

У афіцыйнай гістарычнай палітыцы Беларусі адбываецца відавочны тэктанічны зрух, які звязаны з адыходам ад гістарычнага наратыва, які выбудоўваў агульную прастору з Расійскай дзяржавай. Падаецца, што такі зрух абумоўлены злучэннем дзвюх груп фактараў. Па-першае, пасля "крымскай вясны" нарастае напружанасць у беларуска-расійскіх стасунках, і значна больш увагі ўладам стала надавацца сімвалічнай прасторы і гуманітарнай сферы. Так, пад практычную забарону патрапіла "георгіеўская стужка", практычна маргіналізавана ініцыятыва "Бессмяротны полк" — то бок, тыя сімвалічныя захады, якія былі ініцыяваныя ў Расіі, негатыўна ўспрымаюцца беларускімі ўладамі як сродак мягкай палітыкі па стварэнню агульнага культурна-палітычнага поля. Што раней успрымалася як належнае, зараз робіцца падазроным. Але яўна паўстае пры гэтым патрэба ў больш моцнай версіі нацыянальнай ідэнтычнасці, чым выбудоўвалася раней, а для гэтага патрэбны аб'яднальны гістарычны наратыў. І ранейшая версія гістарычнай памяці, выбудаваная выключна на Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, ужо не задавальняе — паколькі яна замацоўвае Беларусь у постсавецкай прасторы, у зоне расійскага ўплыву. Адсылкі да ранняга сярэднявечча выглядаюць своеасаблівым кампрамісным варыянтам, які і асабліва не

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

будзе раздражняць Расію, але разам з тым мае патэнцыял для выбудовы асаблівай гістарычнай тоеснасці.

Але нельга сказаць, што беларускія ўлады папросту адаптавалі нацыянальны наратыў пачатку 1990-х, хоць і перайшлі да “доўгай генеалогіі” беларускай дзяржаўнасці, якая з’яўляецца адной з рысаў гэтага наратыву. Прынцыповае адрозненне ў тым, што нацыянальны наратыў выбудоўваецца вакол паняцця нацыі, і адпаведна значнымі кампанентамі тады становяцца адраджэнне роднай мовы, культ нацыянальных дзеячоў (будзіцеляў), рэзкае супрацьпастаўленне і адмежаванне ад варожых нацый, у апазіцыі да якіх выбудоўваецца нацыянальная ідэнтычнасць. Беларускі афіцыйны гістарычны наратыў будуецца на дзяржаўніцкай версіі, дзе найбольшае значэнне набывае пераемнасць тэрыторыі і дзяржаўных інстытутаў. Пытанне мовы тады становіцца другасным, будзіцелі замяняюцца дзяржаўнымі дзеячамі (ад князёў да кіраўніцтва беларускай камуністычнай партыі), заўважнае імкненне сціраць і рэтушаваць канфліктныя старонкі дачыненняў з суседзямі.

З іншага боку, эвалюцыя ў бок нацыяналізацыі гістарычнага наратыва выглядае прадказальнай. Так будуецца гістарычная свядомасць і ў іншых краінах рэгіёна, цяжка знайсці больш эфектыўны інструмент для палітычнай мабілізацыі і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці. Хоць доўгі час Беларусь успрымалася як дзяржава, што адхіляецца ад агульнай логікі нацыянальнага будаўніцтва ва Усходняй Еўропе (Kuzio 2002), ёсць логіка палітычнага развіцця, якая патрабуе для незалежнай дзяржавы ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці і выбудоўвання рознапланавай гістарычнай памяці.Новыя школьныя падручнікі па гісторыі Беларусі, выпушчаныя са згоды ўлады паказваюць, што даўняя гісторыя (Полацкая княства і Вялікае Княства Літоўскае) разглядаюцца з больш беларускацэнтрычных пазіцый, старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні пачынаюць успрымацца як папярэднікі актуальнай беларускай дзяржаўнасці, якая такім чынам набывае “доўгую генеалогію. Але прасцей за ўсё далучыць да генеалогіі дзяржаўнасці сярэднявечныя дзяржавы (прасцей, натуральна, не з навуковага гледзішча), больш складанасцей выклікае інтэрпрэтацыя савецкага перыяду, значна больш выбуховага і канфліктнага. Па сутнасці, гэта зараз актуальны выклік для афіцыйнай беларускай гістарычнай палітыкі, і будзем чакаць, які адказ на гэты выклік дадуць новыя школьныя падручнікі..

## Бібліяграфія:


Brzozowska, Anna (2003). Symbols, Myths and Metaphors: the Discursive Battle Over the ‘True’ Belarusian Narrative. *Slovo* 15(1): 49–58.

Goujon, Alexandra (2010). Memorial Narratives of WWII Partisans and Genocide in Belarus. *East European Politics and Societies* 24 (1): 6–25.

Ioffe, Grigory. (2007). Culture Wars, Soul-Searching, and Belarusian Identity. *East-European Politics and Societies* 21 (2): 348–381.

Janmaat, Jan German & Vickers (2007). Education and identity formation in post-cold war Eastern Europe and Asia. *A Journal of Comparative and International Education* 37(3): 267–275.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068


Kuzio, Taras (2002). History, Memory and Nation Building in the Post-Soviet Colonial Space. *Nationalities Papers* 30(2): 241–264.

Leshchenko, Natalia (2004). A Fine Instrument: Two Nation-building Strategies in Post-Soviet Belarus. *Nations and Nationalism* 10(3): 333–352.

Leshchenko, Natalia (2008). The National Ideology and the Basis of the Lukashenka Regime in Belarus. *Europe-Asia Studies* 60(8): 1419–1433.

Sputnik (2017). Прэзідэнт даручыў адлюстраваць станаўленне Беларусі ў падручніках, *Sputnik*, 03.01.2017, https://bel.sputnik.by/society/20170301/1027683489/lukashehnka-uhvaliu-novy-padruchnik-pa-belaruskaj-gistoryi.html (accessed 13 November 2019).

Wilson, Andrew (1997). Myths of National History in Belarus and Ukraine. In *Myths & Nationhood,* Geoffrey Hosking & George Schopflin (eds). New York: Routledge, 182-197.

Zadora Anna. The Politics of History Textbooks in Belarus: Between Globalization and Authoritarian Confinement. In *Nation-Building and History Education in a Global Culture. Globalisation, Comparative Education and Policy Research, vol 13,* Zajda, J. (eds). Dordrecht: Springer, 117–129.

Біч, Міхась (1993). Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. *Беларускі гістарычны часопіс* 1: 15–24.

Бохан, Юрый і Цемушаў, Сцяпан (2016*). Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. Частка 1.* Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ.

Бохан, Юрый і Цемушаў, Сцяпан (2016). *Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. Частка 2.* Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ.

Братачкін, Аляксей (2018). Як пачынаецца «эра Марзалюка». 20 пытаньняў і адказаў пра падручнікі гісторыі Беларусі, 20.08.2018, *Radio Svaboda*, https://www.svaboda.org/a/29443127.html (accessed 13 November 2019).

Гансэн, Імке (2006). Прастора беларускага палітычнага дыскурсу і яго візуальныя і пэрфарматыўныя элементы. In *Геапалітычнае месца Беларусі ў Эўропе і сьвеце,* Булгакаў В. (ed.). Варшава: Выдавецтва Вышэйшай Школы Гандлю і Права імя Рышарда Лазарскага ў Варшаве, 121–134.

Казакевіч, Андрэй (2004). Беларуская сістэма: марфалогія, фізіялогія, генеалогія. *ARCHE* 4: 51–84.

Ластовский, Алексей (2009). Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой**.** *Вестник общественного мнения: Данные. Анализ. Дискуссии* 4: 88–99.

Ластоўскі, Аляксей (2014). Улада і стварэнне гісторыі ў Беларусі: нататкі да канцэптуалізацыі. In *Беларусь у еўрапейскім кантэксце: актуальныя дыскусіі пра нацыябудаўніцтва,* Шпарага, В. і Смалянчук, А. (eds). Вільня: ЕГУ, 2014: 21–28.

Лінднэр, Райнэр (2005). *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX-XX ст.* Санкт-Пецярбург: Неўскі прасцяг.

Марплз, Дэвід (2006). "Ці ёсць у Беларусі беларусы?". In *Геапалітычнае месца Беларусі ў Эўропе і сьвеце,* Булгакаў В. (ed.). Варшава: Выдавецтва Вышэйшай Школы Гандлю і Права імя Рышарда Лазарскага ў Варшаве:

Марплз, Дэвід (2007). Сіла і слабасьць беларускага аўтарытарызму. *ARCHE* 4: 66–77.

Марплз, Дэвід, Падгол, Уладзімер (2008). Палітыка новай памяці ў другой расейскамоўнай дзяржаве. *ARCHE* 5: 91–100.

Наша ніва (2011). Памёр ідэолаг лукашэнкаўскай Беларусі. *Nasha niva*, 14.08.2011, https://nn.by/?c=ar&i=58670 (accessed 13 November 2019).

Нордбэрг, Марк, Кузё, Тарас (2001). Пабудова нацыяў і дзяржаваў. Гістарычная спадчына і нацыянальная самасьвядомасьць у Беларусі і Ўкраіне. Параўнаўчы аналіз. *ARCHE* 5: 65–78.

© 2019 Foundation for Good Politics ISSN 2227-6068

Островская, Татьяна (2010). *Генеалогия исторической памяти белорусов в контексте образовательных практик*. BISS http://www.belinstitute.eu/images/doc-pdf/sa012010ru.pdf (accessed 13 November 2019)..

Радлінг, Пэр (2008). Вялікая Айчынная вайна ў сьвядомасьці беларусаў, *ARCHE* 5: 43–64.

Рудлінг, Пэр Андэрс (2010). Лукашэнка і "чырвона-карычневыя": дзяржаўная ідэалогія, ушанаванне мінулага і палітычная прыналежнасць. *Палітычная сфера* 14: 90–113.

Сагановіч, Генадзь (2001). Дзесяць гадоў беларускай гістарыяграфіі (1991-2000). *Беларускі гістарычны агляд*, http://www.belhistory.eu/page/39/ (accessed 13 November 2019).

Смалянчук, Аляксандр. (2012). "Homo Sovieticus" і беларуская постсавецкая гістарыяграфія. У *Історіографічні дослідження в Україні. Випуск 22. Доповіді та матеріали Міжнародної наукової конференції "Інститут історії України на зламі епох, у світлі традицій та перетворень. 75 роківінституціонального буття" (20-21 жовтня 2011 р., м. Київ)*. Кіїв: Інститут історії України: 189–200.

Трашчанок, Я., Вараб'ёў, А., Валжанкоў, В. (2008). *Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да рэвалюцыі 1917 года.* Падручнік для 10-га класа. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ.

Штыхаў Г., Бохан Ю., Краснова М. (2009). *Гісторыя Беларусі (другая палова XIII – першая палова XVI ст.* Падручнік для 7-га класа. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ.

Штыхаў Г., Цемушаў С., Ракуць В. (2009). *Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.* Падручнік для 6-га класа. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ.

Шчурко, Таццяна (2010). Рэпрэзентацыя жанчын у падручніках па гісторыі Беларусі (2009-2012). *Палітычная сфера* 24: 56–77.